Бібліятэка Мінскага гарадского аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

Мікола ЧАРНЯЎСКІ

# *Свая ёсць песня...*

Эсэ
Літаратурныя партрэты
Успаміны

МІНСК
ВЫДАВЕЦТВА «ЧАТЫРЫ ЧВЭРЦІ»
2020

УДК 821.161.3.09+929
ББК 83.3(4Беи)
Ч49

*Серыя заснавана ў 2011 годзе*

**Рэдакцыйны савет:**
*Міхась Пазнякоў (старшыня), Ліліяна Анцух, Анатоль Аўруцін, Уладзімір Гніламёдаў, Казімір Камейша, Наталля Касцючэнка, Алесь Марціновіч, Васіль Шырко*

**Галоўны рэдактар серыі**
*Міхась Пазнякоў*

**Чарняўскі, М. М.**
Ч49 Свая ёсць песня… : эсэ, літаратурныя партрэты, успаміны / Мікола Чарняўскі. — Мінск : Чатыры чвэрці, 2020. — 192 с. — (Бібліятэка Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі).
ISBN 978-985-581-372-0.

Эсэ і літаратурныя партрэты, змешчаныя ў новай кнізе пісьменніка Міколы Чарняўскага, знаёмяць з вядомымі паэтамі і празаікамі сучаснага пакалення. Большасць з іх — гэта яго равеснікі, сябры па жыцці і творчасці: Мікола Маляўка, Казімір Камейша, Уладзімір Дзюба, Анатоль Зэкаў, Уладзімір Мацвеенка, Уладзімір Мазго, Васіль Ткачоў і інш.

Праўдзіва, з добрым веданнем таго, аб чым апавядае, прыгадвае аўтар таксама далёкую пару свайго супрацоўніцтва з газетай «Піянер Беларусі», працу ў рэдакцыі часопіса «Бярозка»; узнаўляе гісторыю са знакамітай паэмай «Сказ пра Лысую гару», сустрэчы з яе аўтарам — народным паэтам Беларусі Нілам Гілевічам; дзеліцца ўспамінамі пра кнігу свайго маленства «Ніколі не забудзем».

«Свая ёсць песня…» можа стаць карыснаю для ўсіх, хто цікавіцца беларускай літаратурай, паважліва ставіцца да роднага слова.

**УДК 821.161.3.09+929**
**ББК 83.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-581-372-0**

© Чарняўскі М. М., 2020
© Афармленне. ТДА «Выдавецтва “Чатыры чвэрці”», 2020

# *СВАЯ ЁСЦЬ ПЕСНЯ Ў КОЖНЫМ ЧАСЕ...*

## «ПАЗЫЧУ КОЛЕРЫ Ў ВЯСЁЛКІ...»

На сваім вяку быў я сведкам трох, як мне здаецца, самых баяздольных «прызываў у літвойска»: першым стаўся той, барадулінскі, падчас другога — «прызываўся» сам, а калі наспеў час трэцяга — да яго таксама давялося ў нейкай меры прычыніцца. Праўда, на гэты раз, у 1970-я ды 1980-я, мне ўжо выпаў гонар асабіста «выпісваць позвы» шматлікім «прызыўнікам», якія настойліва стукаліся ў дзверы літаратурнага камісарыята, шукалі свайго прызнання, права на зброю — трапнае паэтычнае пяро з нязбітым прыцэлам на не такі ўжо далёкі поспех. Працаваў я тады ў рэдакцыі часопіса «Бярозка», і кожны дзень на мой стол клаліся дзясяткі (мала калі менш) чытацкіх лістоў з іх першымі спробамі пяра. Можа, таму часопісны «Верасок» ніколі не адчуваў недахопу ў творах пачаткоўцаў, тут заўсёды было «завозна». Многіх аўтараў тых лістоў я ўжо здалёк распазнаваў па почырку, не чытаючы адрас, ведаў, адкуль яны, ад каго.

Мог бы шмат каго назваць. Прыемна, што многія з іх, стаўшы сёння вусатымі і бязвусымі мэтрамі, ушанаваныя званнямі, пачэсна нясуць нялёгкую службу ў нашай літаратуры, знайшлі сваё месца ў ёй. На жаль, не ўсім «прызыўнікам» даўся «марш-кідок» з поўнай выкладкай цярплівасці і жадання служыць у літвойску, стаць палоннікамі яе чароўнасці Музы. Разгубіліся і згубіліся ў вірлівым побыце нашага жыцця…

Па-свойму адметным, заўважным быў почырк у Валодзі Мазго — вучня з гарадскога пасёлка Зэльва. На першы позірк лі-

тары выглядалі нейкімі нязграбнымі, мала прывабнымі, што, прызнаюся, нават адбівала ахвоту чытаць. Калі ж, адпрэчыўшы гэтую міжвольную непрыязнасць, браўся за вершы, настрой адразу ж мяняўся: гэтыя нязграбныя з выгляду радкі «дыхалі» паэзіяй! Не па гадах сталай, вобразнай, пранікнёнай, здзіўляючы ўдумлівасцю аўтара, прыкметным паэтычным майстэрствам, уменнем валодаць словам. Навучаны за час працы ў рэдакцыі штукарствам вучнёўскага плагіяцтва, спачатку нават сумненне ўзяло: ці не «пазычыў» у каго? Як часта рабілася ў такіх выпадках, давялося спачатку асцярожнічаць: дашлі новыя вершы. Калі нячысты на руку, то не можа быць, каб не папаўся на кручок сумнення! А што? Хіба не лішне перастрахавацца, каб потым не чырванець, калі плагіят выкрыюць чытачы, хіба не прымусяць засумнявацца такія, напрыклад, радкі чатырнаццацігадовага паэта, якія чамусьці адбіліся ў маёй памяці да сённяшняга дня, нібыта стаяць перад вачыма, ажыўленыя вучнёўскаю рукой: «*У лесе цішыня такая: чуваць, як дыхае кара…*» І канцоўка: «*Лес і цяпер да болю помніць снарадаў стогн і куляў віск. Як расстралянай цішы помнік стаіць у лесе абеліск*». А хіба мог не ўразіць сваёй баладнасцю, мог забыцца ягоны «*тройчы расстраляны перунамі волат-дуб, наднёманскі герой*», які *«дрэмле зорнай ноччу над барамі бессмяротны, вечна малады, і для нас нябачна жалудамі атрасае на мурог гады*»?

Новыя вершы, што прыходзілі ад Валодзі Мазго ў «Бярозку», а таксама тыя публікацыі, што пачалі з’яўляцца неўзабаве ў «дарослых» рэспубліканскіх выданнях — у «Чырвонай змене» і ў часопісе «Маладосць» — канчаткова пераканалі кожнага, хто прачытаў іх: у нашу літаратуру ідзе сапраўды таленавіты паэт, са сваім лірычным «Я», з адметным арсеналам тэм і мастацкіх вобразаў, са сваёй жыццёвай пазіцыяй, з уласным адчуваннем і ўспрыманнем навакольнага свету, з яго хараством і спадзяваннямі на ўзаемнасць, на творчую акрыленасць, узлёт «*песні новай*»:

Пазычу колеры ў вясёлкі,
Цяпло пазычу у агню.
Пасля
ў прынёманскім пасёлку
Закалыхаю цішыню.
Закалыхаю песняй новай,
Прайдуся па былых слядах.
…Няхай у сэрцы спеюць словы,
Як спеюць яблыкі ў садах.

На той час я мала чаго ведаў пра жыццё маладога паэта. Пазней, калі сталі вядомыя некаторыя звесткі з яго не такой ужо і багатай біяграфіі, я міжволі пранікся пачуццём павагі да Валодзі, яшчэ глыбей паверыў у шчырасць вершаваных радкоў, што сталі водгуллем гадоў, пражытых далёка ад родных мясцін, таго выбару, які зрабіў ён у адносінах да беларускай мовы: «*Вітаў — ускрылены хлапчук — нябёс і траў хаўрус, калі збалелаю адчуў душою: — Беларус! Вясна сібірская да нас прыйшла ва ўсёй красе…*» «*Завея сцелецца абрусам. А ў Гродна птах панёс вясну. Па ўсёй Сібіры беларусам у хвілю гэту не да сну*»…

Як і мне спачатку, чытачам першага паэтычнага зборніка Уладзіміра Мазго, які выйшаў з друку ў 1982 годзе, напэўна, было няўцям, адкуль, калі перайначыць вядомыя святлоўскія радкі, у хлопца сібірская туга, чаму ў яго вершах не адзін раз згадваецца далёкі сібірскі край, не пакідае жаданне «*…прычасціцца кедровым водарам тайгі*», яе першароднай красой? Адказ на гэтае пытанне займае ў паэтавай аўтабіяграфіі ўсяго адзін радок: пяць гадоў жыў у Сібіры, дзе бацька працаваў на лесанарыхтоўках.

Нарадзіўся ж Уладзімір Мазго 5 сакавіка 1959 года ў гарадскім пасёлку Зэльва. У сям'і рабочага. Іх сям'ю можна лічыць інтэрнацыянальнай: бацька — родам з Віцебшчыны, а маці — са Смаленшчыны. Калі Валодзю было чатыры гады, бацька з сям'ёю ў пошуках заробкаў пераехаў у горад Топкі, што ў Кемераўскай вобласці. Там Валодзя пайшоў у школу, паспеў скончыць два класы.

Вярнуўшыся ў Беларусь, бацькі пасяліліся ў родных мясцінах. У прыгожай і азёрнай вёсцы Бярэжкі, што ў трох кіламетрах ад Зэльвы. Паўстала пытанне: куды аддаць сына вучыцца? Паколькі Валодзя вучобу пачынаў у Сібіры, добра не ведаў беларускай мовы, бацькі, паразважаўшы, аддалі яго ў райцэнтраўскую рускамоўную школу-дзесяцігодку. Будучы паэт шмат чытаў. Сярод кніг, што траплялі пад руку, нямала было твораў беларускай літаратуры. І адбылося тое, што, здавалася б, не магло адбыцца ў той час, калі «новыя рускія» сотнямі пісалі заявы, вызваляючы сваіх нашчадкаў ад вывучэння беларускай мовы, каб потым не было з ёю лішніх клопатаў у жыццёвых варунках: зачараваны мілагучнасцю нашай мовы, харaством прыроды, сярод якой рос, Валодзя Мазго, будучы шасцікласнікам, пачаў пісаць вершы. Тады ж упершыню надрукаваўся ў зэльвенскай раённай газеце «Праца». Было гэта ў 1972 годзе.

З таго часу беларускае слова назаўсёды стала для яго родным, блізкім, сваім, ён на ўсё жыццё пранікся бязмежнай любоўю да Яго.

Менавіта гэтыя любоў і захапленне паэзіяй паспрыялі далейшаму выбару, творчаму арыенціру: пасля заканчэння школы рабочай моладзі ён доўга не раздумваў — падаўся працягваць вучобу на філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна.

Калі ўжо быў студэнтам 3-га курса, перавёўся на завочнае аддзяленне: узяло верх жаданне паспытаць працоўнага хлеба, глыбей акунуцца ў жыццё, напэўна ж, менш летуценна-рамантычнае, чым студэнцкае, але па-свойму вірлівае, з мноствам нязвыклых праблем і клопатаў, дзе можна пачуцца больш самастойным, патрэбным свайму «анёлу нябеснаму» — паэзіі, творчасці. Працаваў карэспандэнтам хойніцкай раённай газеты, а надышоў час выканаць «пачэсны грамадзянскі абавязак» — два гады адслужыў у тагачаснай Савецкай Арміі. Зноў жа, служыць выпала далёка ад дому, у Прыбалтыцы. Туды ж разам з аўтарам быў «прызваны», знайшоўшы месцейка ў салдацкім чамадане, і рукапіс яго першага паэтычнага зборніка.

Як прызнаваўся мне Валодзя, неспакой за лёс рукапісу быў больш пакутны і турботны, чым усе нечаканыя трывогі, якія перажыў ён «у вучэбцы», а потым у танкавым падраздзяленні. Трывожыўся і хваляваўся ад таго, што ў казарменнай тумбачцы хтосьці з «рукастых», якія водзяцца і сярод браткоў-салдацікаў, мог паквапіцца на папяровыя аркушы, напісаныя незразумелай беларускай мовай, не ўкрасці, а проста выкінуць, як нейкую непатрэбшчыну. На шчасце, такога не адбылося, а рукапіс, наадварот, папоўніўся новымі радкамі, народжанымі буднямі армейскага жыцця, сагрэтымі шчырасцю салдацкага сэрца: «*Нас два гады чакаюць тоні, азёры роднай стараны… Не нам кляновыя далоні кладуць на плечы курганы*»; «*Дрыготкай цішы парашут павіс над танкадромам. Шматкуюць нечыю душу скупыя ўдары грому*»…

На гэтым хваляванні за лёс прыкметна патаўсцелага і ўзмужнелага тэматычна і паэтычна рукапісу не скончыліся. Вярнуўшыся са службы, Уладзімір Мазго адважыўся «пастукацца» з ім у выдавецтва «Мастацкая літаратура». Рукапіс зборніка прынялі, але на закрытую рэцэнзію ён трапіў да былога вайскоўца-афіцэра, надзвычай прыдзірлівага і патрабавальнага рускамоўнага паэта, якому цяжка было спадабацца ўсім, хто прэтэндаваў на выданне сваёй кніжкі. На гэты раз не паднялася рука ў Фёдара Архіпавіча на маладога паэта, прысуд быў станоўчы: зборнік «Пад спеў крыніц» можна выдаваць. Ды яно, напэўна, інакш і не магло быць: пад вокладкай зборніка з даволі традыцыйнай назвай чытачоў чакала шмат таго, што не магло не закрануць струны іх душ. Пра ўсё, што ён бачыў, адчуў, перажыў, малады паэт расказаў пранікнёна і ўсхвалявана, з пачуццём: пра тую ж Сібір, пра гады студэнцтва і службы ў арміі, пра сваю рачулку Зальвянку, што «пяшчотная, як дотык траў, журчыць… матчынаю мовай, непадуладнаю вятрам, вірыць штовесну абнаўленнем і сэрца поўнячы натхненнем, бы плоткамі рыбацкі мех»; пра гады ваеннага ліхалецця і цішыню, што «ў акопах расцвіла рамонкам»,

вядома ж, пра каханне і хараство роднай прыроды, дзе ўсіх нас чакае радасць першаадкрыцця як у прыродзе, так і ў адчуванні самой паэзіі: «*Дрымотны лес загушкае вясёлае дзяўчо. Ёй неба сіняй птушкаю садзіцца на плячо…*» і «*Хай сабе яшчэ не лес — сярод пнёў і трэсак на калені сонцу ўзлез малады падлесак…*»

Пабываўшы разам з аўтарам у розных жыццёвых варунках, не заляжаўшыся на выдавецкіх паліцах, першая кніжка паэта «Пад спеў крыніц» стала для дваццацітрохгадовага паэта Уладзіміра Мазго пропускам у Саюз пісьменнікаў Беларусі, што ў тыя гады выглядала нават сенсацыйна, ці, як сказалі б сёння, было нонсенсам. Ён стаў адным з самых маладых пісьменнікаў, перад кім тады ўхвальна расчыніліся дзверы творчага саюза, каго прызналі прафесійным літаратарам.

Гэтую прафесійную годнасць і вартасць паэт плённа даказвае ўсё жыццё, ад кніжкі да кніжкі, ад радка да радка, напаўняючы іх узнёсласцю спеўнай душы, святлом дабрыні, шчырай захопленасцю ад сустрэч з хараством і непаўторнасцю кожнага пражытага дня, з людзьмі, залацінкамі сапраўднай паэзіі, навізною ўдала знойдзеных вобразаў і рыфмаў, мелодыкай роднага слова, любасцю да ўсяго, што акрыляе думкі і памкненні паэта, дорыць яму крынічную прасветленасць натхнення:

Прачнуцца —
І здзівіцца дню,
І сонейку здзівіцца.
Нібы вось так
Упершыню
Нанова нарадзіцца.

Душой уласнаю адчуць
Сваю зямлю,
Край мілы,
І не лапаткі развінуць,
А складзеныя
Крылы…

З гадамі сталеў аўтар, сталела яго творчасць, набываючы новыя грані адметнасці, тэматычнай разнастайнасці, вобразнасці, як і само жыццё, мяняўся погляд паэта на яго, на ўнутраны свет свайго лірычнага героя. Паступова тая ўзнёсласць, што была ўласціва маладосці, пачала набываць прыкметную сацыяльную завостранасць, філасофскую заглыбленасць і асэнсаванасць, надзённасць гучання, дзе лірыка ў пэўнай ступені саступіла месца публіцыстычнасці, не страціўшы аднак галоўнага — чалавечай цеплыні, трывогі за лёс сённяшняга мадэрнізаванага і зацугляна-га раптоўнаю навалаю праблем, што абрынуліся на думкі і душы людзей, пакалення, калі «…час, як экстрасэнс, намацвае сакрэты»:

Як мы жывём
Цяпер —
На скрыжаванні
Веку?
Ці сябар ты,
Ці звер
Другому чалавеку?..

Адказ на гэтае ды на іншыя не менш складаныя пытанні паэт імкнецца знайсці ў пазнейшых зборніках вершаў і паэм «Вершаліна» і «Марафон», якія ўбачылі свет на працягу дзесяці гадоў, што мінулі з часу выхаду першай кніжкі. Чым адметныя яны? Творы вылучаюцца абвостраным пачуццём гісторыі і сучаснасці, сапраўднага кахання, неабходнасці быць духоўна багатым і прыгожым. Сівая мінуўшчына роднага краю гэтак жа глыбока хвалюе яго, як і супярэчлівая сучаснасць. «Наша жыццё, — сцвярджае паэт, — гэта няспынны марафон, праз які трэба з годнасцю пранесці мару і веру, надзею і каханне, сваю чалавечую годнасць: *“У вочы мне глядзіць зямля, як маці — сыну. І сорамна — глядзіць, і шчасна — след пакінуць”*». Пачуццё грамадзянскай адказнасці за ўсё жывое, тэма адзінства чалавека і прыроды арганічна

зліваюцца ў вершах У. Мазго з роздумам пра сваё месца ў гэтым свеце, у якім, на думку паэта, павінна пераважаць толькі такая «зялёная зайздрасць»:

Зайздрошчу лесу:
Ён глыбока
У глебу родную
Урос.
Зайздрошчу лесу:
Ён высока
Узняўся ўгору —
Да нябёс.
Тут,
Пад сасновай вершалінай,
Цар-грыб
Скідае капялюш.
Тут пні імшэюць
І галіны,
Але няма
Замшэлых душ…

Ёсць такі няхітры, але надзвычай надзейны ручны інструмент, які неабходны ў слясарстве, каб прабіць нейкую дзірку ў метале, у камені, дрэве. Аднак даўно ўжо вядома і даказана многімі, што і ў літаратурнай гаспадарцы прабойнік — рэч неабходная і карысная. Калі ён ёсць — лёгка прабіцца ў лаўрэаты, трапіць у спіс узнагароджаных ды адзначаных вышэйшай увагай, не кажучы ўжо пра такую, здавалася б, дробязь як выданне чарговага тома. Праўда, каб дасканала авалодаць ім, гэтым прабойнікам, таксама патрэбна належнае ўмельства, якое найчасцей мяжуе з нахаблівай настырнасцю.

Не ведаю, як там на лецішчы, а вось у творчай майстэрні паэта Мазго, мяркуючы па ўсім, яго не знойдзеш. Працуючы ў выдавецтве, сярод «сваіх», але маючы сціплы характар, ён ажно пятнаццаць гадоў чакаў свята спаткання са сваёй новай кнігай паэзіі

«Анёл нябесны», якая ўсё ж убачыла свет, ды ў «Бібліятэцы Саюза пісьменнікаў Беларусі». У гэтым зборніку найбольш поўна і пераканаўча адлюстравалася шматграннасць таленту паэта.

Я поўнасцю згодны з думкаю нашага прызнанага майстра крытычнага цэху Алеся Марціновіча, які, рэцэнзуючы згаданы зборнік, піша: «Шмат у “Анёле нябесным” твораў, якія сведчаць пра паэтычнае майстэрства аўтара гэтай кнігі, пашырэнне ўнутранага свету яго лірычнага героя, а таксама паглыбленне разваг над жыццём… Прываблівае ў У. Мазго тая настраёвасць, якая проста-такі ліецца з душы яго лірычнага героя, а ён, гэты герой, неадлучны ад зямлі, на якой нарадзіўся і ўзгадаваўся, да самазабыцця ўлюбёны ў яе хараство, таму і спяшаецца падзяліцца з іншымі сваёй замілаванасцю тым, што ягонаму сэрцу блізка і дорага, без чаго ты і сам не свой…»

Сапраўды, у гэтай кніжцы паэта нават самы прыдзірлівы чытач знойдзе шмат такога, блізкага, роднага яго душы і сэрцу, што міжволі зробіць яго «мякчэйшым», кране сваёй непадробнай шчырасцю і замілаванасцю, святлом высокай паэзіі, дзе аўтар яшчэ раз яскрава пацвердзіў, што ён «несумненна паэт — таленавіты», для якога трапная, свежая, удала знойдзеная паэтычная метафара — звычайная з’ява, як і багаты ўлоў земляка-рыбака на Зальвянцы, як і тыя, казачныя, намаляваныя бялюткім туманам палацы за роднымі Бярэжкамі, дзе «*ідуць баравымі сцежкамі баравікі на шпацыр*».

Не асобныя радкі, а цэлыя строфы з вершаў самі па сабе «асядаюць» у памяці, робячы ўражанне ад іх прачытання, ад сустрэчы з кнігай не часова-мімаходным, а болей доўгатэрміновым, а, магчыма, і назаўсёдным: «*Запомнім гэты дом, што памятае нас, дзе льецца малаком праз комін дым, як час*»; «*У Навагрудку самакрутку скруціў махорачны туман. Трава распачала пагудку, свой прэзентуючы дыван*»; «*Прысеў ад спёкі ў рэчку мост, схаваўшыся за гмахі, і да вады бяжыць наўпрост трава ад млоснай смагі*»; «*Я слухаю мелодыю дажджу, які зайграў на клавішах ліс-*

# ЗАМЕСТ ЭПІЛОГА

***

Нішто ў жыцці нам лёгка не даецца.
А хіба ў гэтым шчасце — лёгка жыць,
Калі душу, як боль, не ўзварушыць?
Нішто ў жыцці нам лёгка не даецца.

Але адно даецца, мне здаецца:
Яго пражыць не так, як набяжыць.
Нішто ў жыцці нам лёгка не даецца.
А хіба ў гэтым шчасце — лёгка жыць?

***

У кожным успаміне — свята ёсць,
Бо гэты ўспамін — бы ў храм вяртанне,
Дзе грэлі сэрца мары, спадзяванні.
У кожным успаміне — свята ёсць.

Хіба не свята — наша маладосць,
Хіба не свята — першае каханне?
У кожным успаміне — свята ёсць,
Бо гэты ўспамін — бы ў храм вяртанне.

***

Не бойцеся з мінулым расставацца:
З мінулым жыць — сумнення крыж насіць.
Хіба не лепш — былы боль пагасіць?
Не бойцеся з мінулым расставацца.

Як годна жыў — не трэба азірацца,
Як і сабе, сябрам сваім хлусіць.
Не бойцеся з мінулым расставацца:
З мінулым жыць — сумнення крыж насіць.

ЗМЕСТ

## СВАЯ ЁСЦЬ ПЕСНЯ Ў КОЖНЫМ ЧАСЕ...

«Пазычу колеры ў вясёлкі…»
(*З жыцця Уладзіміра Мазго*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 3

«Хто ведаць жадае, хадзіце сюды…»
(*З жыцця Уладзіміра Мацвеенкі*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 18

«Сцвярджаць сябе ўсёй жыццёвай праўдай…»
(*З жыцця Уладзіміра Дзюбы*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 26

«Свая ёсць песня ў кожным часе…»
(*З жыцця Казіміра Камейшы*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 46

«Любоў мая высокая, як неба…»
*(З жыцця Міколы Маляўкі)* . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 57

«Жыву на зямлі недарма…»
(*З жыцця Расціслава Бензерука*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 98

«Ёсць і вяршынька ў слова, і камель…»
(*З жыцця Анатоля Зэкава*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 103

Да людзей з любоўю ідучы
(*З жыцця Васіля Ткачова*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 111

«Зямля бацькоў, тут лёсу карані…»
(*З жыцця Валерыя Калінічэнкі*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 121

## ГРЭЦЦА ТЫМ, ШТО РОДНАЕ, СВАЁ...

Гарніст далёкага маленства…
(*Па слядах газеты «Піянер Беларусі»*) . . . . . . . . . . . . . . . . . 136

«Бярозкі» дзіўнае святло. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 153

Быў час, быў век, была загадка…
(*Па слядах паэмы «Сказ пра Лысую гару»*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . 161

Пра тое, што нельга забыць
(*Прадмова да новага выдання кнігі «Ніколі не забудзем»*) . . . . . . 172

«Праклён табе, праклён табе, вайна!..»
(*З нагоды выхаду кнігі «Я помню ўсё…»*) . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 181

Замест эпілога

***Нішто ў жыцці нам лёгка не даецца… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
***У кожным успаміне — свята ёсць… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188
***Не бойцеся з мінулым расставацца… . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . 188